У канцы сакавіка бягучага года прадстаўнікі мітраполіі наведалі сабор Святой Троіцы і ўручылі архімандрыту Кірылу, Ганароваму настаяцелю сабора памятную манету, ікону цудатворнай Жыровіцкай Божай Маці і альбом малюнкаў. За час служэння ў настаяцеля храма нямала заслуг, сярод якіх самая галоўная – аднаўленне і будаўніцтва хоцімскай «жамчужыны», вядомай далёка за межамі нашай краіны. На гэты конт сам архімандрыт часта адзначае: «Я самы багаты, бо ў мяне ёсць храм. Пабудаваць яго не так складана, як храм у душы сваёй». У гэтых словах схаваны і сэнс яго жыцця, бо дзень за днём, год за годам ён імкнуўся з дапамогай веры і малітвы гэты храм пабудаваць у душы кожнага, хто да яго звяртаўся і каму была неабходна дапамога.





Архімандрыт Кірыл і сабор Святой Троіцы звязаны непарыўна. На тэрыторыі храма кожны куточак яму знаёмы і дарагі, бо ў кожны сантыметр на працягу многіх гадоў ён укладваў сваю душу і любоў. Гледзячы на храм, нават не верыцца, што крыху больш за шэсцьдзесят гадоў таму гэта велічнае галоўнае ўпрыгожанне Хоцімска з залатымі купаламі мела безнадзейны выгляд. У 1958 годзе, калі малады іерэй Аляксей Бадзіч пасля Мінскай духоўнай семінарыі атрымаў размеркаванне на прыход у Хоцімск, сабор быў на замку. Пасля закрыцця, у 1938 годзе, яго спачатку аддалі пад склад для захоўвання збожжа, а ў 60-я гады тут размясціўся раённы Дом культуры. Так што маладому бацюшку прыйшлося

*«Для чалавека з Богам няма нічога недасягальнага. Мы ўсе можам зрабіць, пабудаваць, стварыць і адкрыць... Але толькі з Богам. Храм не толькі архітэктурнае збудаванне, яго прыгажосць – гэта мова Бога. Наведвайце храм, упрыгожвайце яго сваёй прысутнасцю. І тады душа ваша будзе храмам. Мір і любоў павінны быць у сэрцы кожнага».*
***Архімандрыт Кірыл***

Кузьмічы Смаленскай вобласці ён аднаўляў Вазнясенскі храм.

У часы ваяўнічага атэізму айцец Кірыл па крупінках збіраў царкоўныя рэліквіі. У выніку сабрана ўнікальная калекцыя ікон і царкоўных убораў, самаму старажытнаму з якіх 350 гадоў. Яно насілася яшчэ пры Іаане Грозным. Ёсць у калекцыі і рыза самога Іаана Кранштацкага. Калі свяцейшы цудатворац служыў у Растове, ён яе падпаліў кадзілам, і пакінуў. І яе перадалі айцу Кірылу, як дар. Некаторыя з рарытэтаў святар рэстаўраваў сваімі рукамі.

Да нядаўняга часу, кожны тыдзень архімандрыт Кірыл здзяйсняў памінанне 11 тысяч чалавек – жыхароў Хоцімскага раёна, якія загінулі ў гады Вялікай Айчыннай вайны. Каб людзі не забылі

што маладому бацюшку прыйшлося пачынаць службу ў Свята-Пакроўскай капліцы, размешчанай на могілках. Доўгія гады яна была адзінай у раёне царквой.



Існуе легенда: праект, па якім будаваўся храм, прызначаўся для Клімавіч. У той час гэта быў цэнтр павета, куды ўваходзіла Хоцімская валасць. Аднак па дарозе архітэктара перахапілі купцы, пераканаўшы аддаць праект у Хоцімск. Самым галоўным аргументам стала шапка золата, сабраная мясцовымі жыхарамі.

Падчас размовы айцец Кірыл часта ўспамінае, калі ўпершыню прыбыў у гарадскі пасёлак і ўбачыў зганьбаваны сабор Святой Троіцы. Гэта быў нялёгкі час, калі ўлады не занадта прывечвалі рэлігію, таму было вельмі цяжка супрацьстаяць націску бязбожнікаў. Аднак ён быў моцны ў веры і непахісны ў дасягненні вызначанай мэты. А мэтай было – адраджэнне Свята-Троіцкай царквы.

За ўласныя зберажэнні святар купіў у вёсцы зруб і ўначы з вернікамі прыбудаваў да капліцы алтар. Калі ж паўстала пытанне аб зносе капліцы, прыхаджане, якія прыходзілі сюды маліцца, запалілі свечкі і ўсталі сцяной перад сваёй цэркаўкай. Капліца была ўратавана, але айцец Кірыл быў арыштаваны і пабіты. Аднак, гэта не спыніла яго і ён працягваў ісці да вызначанай мэты. Падрыхтаваў ліст да мясцовых улад і стаў збіраць подпісы. Амаль 9 тысяч прыхаджан падпісаліся пад прашэннем. У 1991 годзе будынак Дома культуры быў вернуты зноў створанаму праваслаўнаму Свята-Троіцкаму прыходу. Рэстаўрацыя сабора ішла не вельмі хутка, так як не хапала сродкаў, нягледзячы на тое, што добрыя людзі ўвесь час імкнуліся дапамагчы.

Нават на восьмым дзесятку бацюшка неаднойчы па будаўнічых справах бываў у Кіеве, Маскве і іншых гарадах Украіны. Яго ўсюды добра ведаюць і паважаюць. Падчас аднаго з інтэрв'ю айцец Кірыл нават расказваў, як у Маскве на вакзале збіраў міласціню на аднаўленне хоцімскага сабора. Усім тлумачыў, што храм будаваўся на грошы трох народаў – беларусаў, украінцаў і рускіх. Значыць, і вяртаць яго да жыцця трэба ўсім светам.

Акрамя будаўніцтва хоцімскай «жамчужыны», айцец Кірыл мае дачыненне да аднаўлення чатырох хоцімскіх храмаў і капліц, звыш дзесяці цэркваў на Магілёўшчыне і Браншчыне. У вёсцы

імёны тых, дзякуючы каму мы жывём у мірнай краіне, святару давялося самому збіраць іх. Незвычайная кніга памяці, напісаная ім ад рукі, захоўваецца і сёння. Пры саборы працуе цудоўная бібліятэка, у асноўным гэта літаратура рэлігіёзнай і гістарычнай тэматыкі. Ёсць вельмі рэдкія экзэмпляры, якія бацюшка прывозіў з самых розных гарадоў.






Дзесяцігоддзі цяжкай працы без выхадных і адпачынкаў. Архімандрыт Кірыл з'яўляецца чалавекам незвычайнай сціпласці, не любіць распавядаць пра свае ўзнагароды. За самаадданую працу на карысць Хоцімшчыны ён неаднойчы адзначаўся кіраўніцтвам

Візітнай карткай нашага прыбесядскага края стаў нацыянальны фестываль перазвону «Хоцімскія перазвоны», які ўпершыню прайшоў у гарадскім пасёлку ў 2006 годзе.



